# У кантэксце ГАЛОЎНАЙ КАШТОЎНАСЦІ

**Напрыканцы мінулага года ў рэдакцыі "Культуры" адбылася сустрэча з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь — прадстаўнікамі камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Ігарам Марзалюком, Аленай Анісім і Ірынай Дарафеевай. Фармат сустрэчы аб'яднаў дзве папулярныя рубрыкі "Рэдакцыя плюс..." і "Гарачая лінія". У выніку ў размове паўдзельнічалі не толькі журналісты "К", але і чытачы. Сустрэча была прысвечана падсумаванню вынікаў "Года культуры" ў Рэспубліцы Беларусь, заканадаўству ў сферы культуры, актуальным пытанням развіцця айчыннай культуры і яе эфектыўнасці.**

Падрыхтаваў
Кастусь АНТАНОВІЧ

**— Пытанне пра найбольш значныя падзеі "Года культуры" задавалі многія з нашых чытачоў. Назавіце, калі ласка, яскравыя падзеі "Года культуры", калі выключыць з пераліку сталыя і паўтаральныя імпрэзы (фестывалі, конкурсы, юбілейныя і памятныя даты і гэтак далей, якія адбыліся б, як кажуць, пры любым надвор'і).**

**Ірына ДАРАФЕЕВА:** — Летась у сферы культуры краіны было зроблена вельмі шмат, усё і не згадаць. Напэўна, важна расказаць пра тое, што кожны з нас зрабіў у межах "Года культуры". Асабіста ў мяне атрымалася плённая праца з многімі прадстаўнікамі музычнай культуры нашай краіны. Яскравым вынікам такога супрацоўніцтва сталі прэм'еры мюзіклаў "Казанова", "Джэйн Эйр", а таксама "Сем таямніц Беларусі". Яны сталі сапраўдным святам для гледачоў, але найперш для студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, якія былі актыўна задзейнічаны ў пастаноўках. Такая практыка робіць з нашых студэнтаў сапраўдных прафесіяналаў, артыстаў. А гэта праца на будучыню.

**Алена АНІСІМ:** — Адметнасцю года стала, мяркую, тое, што не толькі бюджэтныя арганізацыі, але і грамадскія ініцыятывы імкнуліся актыўна выкарыстаць брэнд "Года культуры". Сярод таго мноства разнастайных мерапрыемстваў не маю магчымасці нешта вылучыць. Але важна тое, што намецілася тэндэнцыя па спалучэнні нацыянальнай культуры і бізнесу. Шэраг прыватнікаў пачалі не толькі ахвяраваць на культурныя праекты, але і рабіць інвестыцыі ў гэту сферу, атрымліваючы дывідэнды. Хочацца колькі слоў сказаць пра тую працу, якую мы з калегамі распачалі ў справе падтрымкі культуры. І Таварыства беларускай мовы, і я як дэпутат парламента накіроўвала зварот да нашага Урада з тым, каб на сферу культуры павялічылі працэнт у рэспубліканскім бюджэце. Прыемна адзначыць, што наша прапанова была падтрымана Міністэрствам культуры, каб выдаткі складалі два працэнты ад бюджэту. Такім чынам, упершыню ў 2016 годзе атрымалася спыніць падзенне адлічэнняў на культуру.

**Ігар МАРЗАЛЮК:** — Хачу падаць: вельмі важна, што Міністэрства культуры станоўча адгукнулася на гэту прапанову. У мяне таксама гэты год аказаўся вельмі плённым. Так, дзякуючы ў тым ліку і маім высілкам быў прыняты Кодэкс аб культуры. Калі браць заканадаўчы аспект — для мяне гэта самая галоўная падзея. Апроч таго, як сенатар Савета Рэспублікі 5 склікання ініцыяваў Указ Прэзідэнта аб паляпшэнні і ўдасканаленні заканадаўства ў сферы захавання археалагічнай спадчыны. Для мяне асабіста самай вялікай падзеяй года стала рэканструкцыя і рэстаўрацыя гістарычнага цэнтра Мсціслава. Той, хто быў у гэтым горадзе раней, не пазнае яго. Ганаруся, што разам з калегамі, найперш, археолагам Лявонам Калядзінскім, зрабіў у Мсціславе другое "Бярэсце" — над раскопам старажытнай маставой і рэшткамі гарадскіх умацаванняў. Быў выкарыстаны новы метад кансервацыі, які зэканоміў вялікія дзяржаўныя сродкі.

Працяг — **на старонцы 3.**

*(Працяг. Пачатак на старонцы 1.)*

Цяпер у музейным комплексе можна пазнаёміцца са знойдзенымі ўнікальнымі прадметамі, у тым ліку берасцяной граматай — другой, выяўленай на тэрыторыі Беларусі. Неўзабаве ў Мсціславе з'явіцца адзіны ў краіне стацыянарны, зроблены па ўсіх правілах, бугурт і пляцоўка для стральбы з сярэднявечнага лука. Пра абнаўленне Мсціслава магу расказваць доўга. Але раю ўсім завітаць у гэты старадаўні горад і ўбачыць усё на свае вочы.

**— Зараз у грамадстве актыўна абмяркоўваецца пытанне публічнасці тых рашэнняў, што прымаюцца на розных узроўнях улады, а таксама, уласна, саміх асоб, якія яе ўвасабляюць. Найперш, гаворка пра непасрэдны кантакт з прадстаўнікамі ўладных структур праз сацыяльныя сеткі. Ці разглядаецца магчымасць стварэння старонкі Камісіі па адукацыі, культуры і навуцы і, адпаведна, далейшай працы са зваротамі грамадзян на яе?**

**І. М.:** — Маецца сайт Палаты прадстаўнікоў з дастаткова падрабязнай інфармацыяй пра кожнага дэпутата, пазначаны там і асабістыя электронныя адрасы кожнага з прысутных. Прызнаюся, як чалавек старой генерацыі не люблю карыстацца сацыяльнымі сеткамі. Тым не менш прымусіў сябе стварыць старонку ў адной з сацсетак перад выбарамі, каб наўпрост камунікаваць з выбаршчыкамі. Яна і сёння дзейнічае, мае памочнікі рэгулярна правяраюць яе на наяўнасць пытанняў і канструктыўных прапаноў і перасылаюць іх па электроннай пошце. А неўзабаве ў кожнага з дэпутатаў з'явяцца свае персанальныя сайты са зваротнай сувяззю. Калі з'явіцца пытанне па справе і ў межах маёй кампетэнцыі — адкажу на яго абавязкова.

**І. Д.:** — Да кожнага з нас можна дазваніцца, звярнуцца з пытаннем або прапановай па электроннай пошце.

**А. А.:** — Некалькі гадоў таму ў мяне з'явілася свая старонка ў адной з сацсетак. У пэўным сэнсе гэта трыбуна для выказвання сваіх поглядаў. Мой асабісты сайт ужо ў распрацоўцы, маецца даменнае імя. На ім якраз прадугледжваецца форма электроннага звароту. Я адказваю на ўсе звароты: электронныя, тэлефонныя і пісьмовыя.

**— За тыя некалькі месяцаў, што мой трохгадовы сын наведвае дзіцячы садок, я некалькі разоў чуў скаргі бацькоў, а таксама настаўнікаў і бібліятэкараў, што дзеці з першага класа не ўмеюць размаўляць па-беларуску — гаворка ўжо не ідзе пра тое, што яны гавораць пісьменна ці непісьменна. Яны проста не ўмеюць размаўляць па-беларуску. На маю думку, праблема тут палягае ў змене сацыякультурных варункаў, бо на дадзены момант у выніку перыяду абыякавасці да беларускай мовы і ўсяго беларускага цягам апошніх дзесяцігоддзяў ва ўжо незалежнай дзяржаве выраслі і ўступілі ў жыццё пакаленні абыякавых і нават варожа-ваяўніча настроеных да ўсіх праяў беларускай культуры ў самым шырокім сэнсе людзей. Дык вось, ці не варта ў адпаведнасці з гэтай няпростай сітуацыяй і да вывучэння беларускай мовы падыходзіць ужо як да вывучэння мовы замежнай. Не "выціскаць" з дзіцяці па літарах слова, якое яно і не ведае, а вывучаць, як у англійскай, што dog — гэта сабака, а стол — table. Гучыць катастрафічна, але так і ёсць. І ніякія бабулі з вёсак цяпер па-беларуску размаўляць гарадскіх дзяцей не навучаць — бабулі самі ўжо з гарадскіх.**



Ірына Дарафеева, Ігар Марзалюк і Алена Анісім падчас сустрэчы ў рэдакцыі "К". / Фота Сяргея ТРАФІЛАВА

У кантэксце ГАЛОЎНАЙ КАШТОЎНАСЦІ

## Рэаліі і стратэгія заканадаўчай ініцыятывы

**А. А.:** — Пытанне вельмі важнае. Але, на мой погляд, вырашаць яго трэба комплексна. Найперш, стварыць інфармацыйнае асяроддзе на беларускай мове: хаця б адзін тэлеканал з вяшчаннем цалкам і толькі па-беларуску розных перадач (і для дзяцей, і забаўляльных, і палітычных, і культурных, і спартыўных, фільмаў, агучаных ці дубляваных па-беларуску і гэтак далей). Па-другое, сістэма адукацыі павінна працаваць так, каб дзіця і ў садку, і ў школе мела магчымасць чуць і размаўляць па-беларуску. Але гэта ў дадатак да таго, што і ў сям'і варта праводзіць беларускамоўнае выхаванне праз чытанне кніг, спевы беларускіх песень і гэтак далей. Плён дае менавіта такі падыход. І вядома, патрэбны нацыянальны ўніверсітэт з беларускай мовай выкладання розных прадметаў.

**І.М.:** — Калі ў 1995 годзе прайшоў Рэспубліканскі рэферэндум, то размова вялася пра роўнасць дзвюх моў, а не пра знішчэнне адной на карысць іншай. Мне падаецца, што варта зрабіць адну, але вельмі важную папраўку ў Закон аб мовах Рэспублікі Беларусь. У справе карыстання дзяржаўнымі мовамі варта вярнуць злучнік "і": "беларускай і рускай мовамі". Цяпер жа дубляваць маркіроўку на прадукцыі, шыльдах на ўстановах не патрабуецца.

Другі вельмі важны нюанс. У Мінску нямала дзяцей вучыцца ў школах і гімназіях з беларускай мовай навучання. Вось толькі рабочых сшыткаў па спецыяльнасцях на беларускай мове не робяць і рабіць пакуль не збіраюцца. Бо гэта, маўляў, дадатковая, а не асноўная рэч. Праблема і ў здабыцці падручнікаў на беларускай мове. Хіба гэта роўнасць?! Пра гэта трэба казаць уголас. Тым не менш зрухі да лепшага сёння маюцца. Але не трэба забываць, што гэтая праблема і ў нас саміх, асабістым выбары грамадзянаў краіны. Дзіця гаворыць так, як гавораць яго бацькі.

**І. Д.:** — У гэтым пытанні нельга праяўляць пасіўнасць. І калі збярэцца супольнасць бацькоў і вырашаць, што іх дзеці павінны выхоўвацца ў садку, вучыцца ў школе па-беларуску, то ў іх, перакакана, усё атрымаецца.

**— І ці не час займацца стварэннем беларускамоўных груп і заняткаў ва ўсіх дзіцячых садках краіны? Гэтак жа, як з трохгодкамі займаюцца лепкай ці спевамі, варта займацца мовай. Таму такое пытанне. У Цэнтралізаванай сістэме бібліятэк горада Мінска мы сутыкнуліся з цікавай практыкай (думаю, яна дзе-нідзе выкарыстоўваецца): школа ранняга развіцця. Магчыма, варта ўключыць у працэс установы культуры і рабіць такія школы як агульнанацыянальны праект па вывучэнні беларускай мовы і культуры ў самым шырокім сэнсе. Дзяцей там прымаюць з 6 месяцаў і маюць формы працы з імі... Карацей, нешта накшталт агульнанацыянальнай "Мова нанова".**

**А.А.:** — Надзвычай цікавая прапанова. Думаю, што знойдуцца людзі, якія захочуць яе рэалізаваць. І ў такім выпадку шмат хто выкажа ахвоту і жаданне яе падтрымаць. Я маю на ўвазе школы ранняга развіцця. Але як і ва ўсялякай справе, нехта павінен узяць на сябе гэты клопат. Бо ўсе такія асяродкі для навучання і выхавання — прыватныя, а не дзяржаўныя.

**— Ці плануецца ініцыяваць адмену гастрольных пасведчанняў для айчынных артыстаў? Усё ж выглядаюць яны суцэльным анахранізмам і, да ўсяго, бюракратызуюць працэдуру арганізацыі тэатральных, канцэртных і відовішчных мерапрыемстваў.**

**І.М.:** — А наколькі на самой справе гэтыя пасведчанні замінаюць працэдуры арганізацыі?

**І.Д.:** — На мой погляд, адмяняць гастрольныя пасведчанні для айчынных артыстаў мела б сэнс толькі дыферэнцыравана: да прыкладу, калі гаворка ідзе пра артыстаў, якія працуюць у дзяржаўных канцэртных арганізацыях, якія нясуць адказнасць за якасць і мастацкі ўзровень канцэртных праграм, альбо пра артыстаў, якія маюць ганаровыя званні, што само па сабе з'яўляецца паказчыкам іх прафесійнага майстэрства. А вось за арганізацыю канцэртных выступленняў усіх астатніх артыстаў — самадзейных, аматарскіх, самаабвешчаных і самараспіяраных павінны адказваць не толькі самі артысты, але і органы, якія кантралююць канцэртна-гастрольную дзейнасць на пэўнай тэрыторыі, каб абараніць спажыўца ад няякасна прадастаўленых паслуг. А вось для правядзення канцэртаў замежных выканаўцаў кошт такіх гастрольных пасведчанняў трэба было б усталяваць у дзясяткі разоў вышэй, чым разліковая базавая адзінка, каб абараніць айчынны рынак вытворцаў такіх паслуг, як ён абаронены ва ўсім свеце, у тым ліку і ў Расіі (паспрабуйце арганізаваць хоць адзін годны канцэрт айчыннага артыста ў любой краіне, не маючы кантракту з прадстаўніком гэтай краіны, таго, хто трымаецца перш за ўсё абароны сваіх уласных інтарэсаў). Такое ж становішча спраў павінна тычыцца і арэнды канцэртных пляцовак і прадастаўлення рэкламных месцаў і гэтак далей. Тады наш айчынны глядач зможа ўбачыць толькі канцэрты сапраўдных дзеючых "сусветных зорак", а не трэція і шостыя эшалоны ў сваіх падвойных і патройных складах. Правядзенне такіх канцэртаў стане камерцыйна нявыгадна.

**— Важкае пытанне — нацыянальны дзіцячы канал. Прыклад, 4 дыскі "Беларусьфільма" з анімацыяй за апошнія гадоў пяць. На кожным — не менш як гадзіна якаснага кантэнту. На "Рыбку по имени Нельзя", на "Выцінанку-выразанку" ды на іншыя стужкі дзеці "заліпаюць" не горш чым, скажам, на "рабакараў" ці "трансформераў", фіксікаў і смяшарыкаў. Да ўсяго, праз тыя дзіцячыя каналы, якія транслююцца ў нашых сетках, дзеці даведваюцца пакрысе пра гісторыю і геаграфію Расіі ці наогул далёкага замежжа. А гэта ўжо пытанне ідэалагічнае. Карацей, востра патрабуецца такі тэлеканал, каб на ім знаходзілася месца для нацыянальнага дзіцячага кантэнту. Так, там могуць ісці і серыялы ды асобныя стужкі замежнай вытворчасці, у тым ліку папулярныя хіты, але ж і кіназказкам, юнацкім фільмам, анімацыі беларускай вытворчасці мусіць знайсціся не менш як палова пазіцый у кантэнце.**

**А.А.:** — Я ўвесь час пра неабходнасць тэлеканала на беларускай мове кажу. Літва нашмат меншая за Беларусь, але транслюе з дзясятак каналаў на літоўскай мове. Чым не прыклад для нашай краіны? Пытанне ў палітычнай волі і прафесіяналізме кадраў, а таксама ў якасці тэлевізійнай прадукцыі на беларускай мове.

**— Аляксандр Кацікаў, артыст ансамбля "Беларускія Песняры", звяртаецца да Ірыны Дарафеевай з пытаннем адносна Заслужанага артыста Беларусі Валерыя Дайнэкі. Ні для каго не сакрэт тое, што ён з'яўляецца адным з любімых спевакоў за апошнія дзесяцігоддзі ў нашай краіне. Песні, выкананыя Валерыем з упэўненасцю можна назваць мастацкімі сімваламі нашай краіны. Шматграннасць таленту гэтага выдатнага артыста праяўляецца ў перадачы ведаў маладым і, як следства, яго вучні становяцца лаўрэатамі разнастайных, у большасці сваёй міжнародных, конкурсаў.**

Заканчэнне — **на старонках 4 — 5.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

